# Часціца як службовая часціна мовы

**А. В. Ляўковіч,**
настаўнік беларускай мовы і літаратуры вышэйшай катэгорыі
гімназіі № 3 г. Пінска імя В. З. Каржа

**Мэта занятка:**
стварыць умовы для актыўнай пазнавальнай дзейнасці вучняў па засваенні тэмы і выкарыстанні атрыманых ведаў у практычнай дзейнасці.

**Задачы:**
- пазнаёміць вучняў са службовай часцінай мовы — часціцай, дапамагчы асэнсаваць яе ролю ў маўленні, паказаць багацце адценняў іх значэнняў
- выпрацоўваць уменне фармуляваць азначэнне часціцы, распазнаваць яе ў тэксце, вызначаць ролю, адрозніваць ад іншых службовых часцін мовы, выяўляць значэнні часціц у сказах;
- выхоўваць цікавасць і павагу да роднай мовы, свядомае і адказнае стаўленне да вынікаў вучэбнай дзейнасці.

**Тып урока:** урок – тлумачэнне новага матэрыялу, урок-даследаванне
**Абсталяванне:** падручнік, карткі з заданнямі для кожнага вучня, табліцы-хемы, прэзентацыя, тэарэтычны матэрыял для кожнага вучня.

**<u>Толькі</u>** ***тады веды робяцца нашым сталым набыткам, калі мы прыходзім да іх, здабываем іх самі.***
***Якуб Колас***

## Ход урока

1. **<u>Арганізацыйны момант.</u>**

**Н:** Вось ужо звінеў званок,
Запрасіў нас на ўрок.
Добры дзень, я вас вітаю,
Да занятнаў запрашаю.
Хай занятак будзе плённым,
І цікавым, і натхнёным,
Поспехаў я вам жадаю,
Калі што – я паспрыяю.

Добры дзень, паважаныя вучні, добры дзень, шаноўныя госці! Пачынаць любую справу патрэбна з добрага настрою. Створым добры, дружалюбны настрой. Усміхніцеся адзін аднаму, нашым гасцям. І няхай сённяшні ўрок пройдзе толькі з добрай усмешкай на вашых вуснах.

2. **Арыентацыйна-матывацыйны этап.**

**Н:** Сённяшні наш урок пройдзе трошкі ў незвычайнай форме: мы будзем займацца і навуковымі даследаваннямі ў камандах, і паглыбляцца ў казкі. У кожнай каманды ёсць капітаны. Яны будуць дапамагаць вам у рабоце, адказваць на незразумелыя пытанні (калі будуць узнікаць такія). А ў канцы ўрока менавіта яны ацэняць вашу работу на ўроку, назавуць самых актыўных і выставяць ім адзнаку.

**Н:** Ну, а зараз нам трэба даведацца, над якой жа тэмай мы будзем сёння працаваць. Вы бачыце, што на дошцы на месцы тэмы знаходзяцца толькі ружовыя лісты з нумарамі. Іх неабходна перавярнуць. А атрымаецца гэта, калі кожная каманда правільна адкажа на пытанні, змешчаныя на такога ж колеру лістках.

Пытанні:

1. *Чым службовыя часціны мовы адрозніваюцца ад самастойных?*
2. *Пералічыце ўсе самастойныя і службовыя часціны мовы.*
3. *Што называецца прыназоўнікам? Якая асноўная адметная рыса прыназоўніка?*
4. *Якія бываюць прыназоўнікі па будове, па паходжанні?*
5. *Што называецца злучнікам? На якія групы яны падзяляюцца па значэнні?*
6. *Чым адрозніваюцца парныя злучнікі ад паўторных?*

**Н:** Сённяшняя тэма нашага ўрока “Часціца”. На дошцы запісаны пытанні, на якія мы зможам адказаць у канцы ўрока.

*Пытанні на дошцы:*

1) *Што такое часціца?*
2) *Якую ролю яна адыгрывае ў маўленні?*
3) *Ці маюць часціцы граматычныя прыметы?*
4) *Ці выконваюць сінтаксічную ролю?*
5) *На якія разрады па значэнні падзяляюцца часціцы?*

3. **Вывучэнне новага матэрыялу.**

**Н:** Першая задача, якую нам трэба вырашыць, – даведацца, што называецца часціцай.

Пачнём нашу работу з невялікага гумарыстычнага апавядання ***Н.І. Сладкова «Скажы, што ты ясі, і я скажу, хто ты».***

- Адгадай, хто я. Ем жукоў і мурашак і жыву на елцы.
- **Няўжо** дзяцел?
- **Не**, **вось** **і** **не** ўгадаў! Яшчэ я ем вусняў і лічынак.
- **Як раз** вусняў і лічынак любяць дразды.
- Сапраўды, дразды, а **не** я. Бо я грызу скінутыя ласямі рогі.
- **Ну**, тады ты, напэўна, лясная мыш.
- Вось яшчэ – мыш! Бывае, я **нават** сама ем мышэй.
- Добра! Тады ты кошка!
- **Куды** ўжо – кошка! Часам я ем яшчарак. І зрэдку рыбу.
- Добра, ты – чапля.
- **Дзе** ўжо – чапля! Я лаўлю птушанят і цягаю з птушыных гнёздаў яйкі.
- Ну тады куніца!

- **<u>Вось</u>** дакладна – **<u>не</u>** куніца. Куніца - мой стары вораг. А я паела **<u>б</u>** яшчэ арэхаў, насення елак і соснаў, ягадаў і грыбоў.

- Хутчэй за ўсё, ты – свіння, **<u>раз</u>** лопаеш усё запар. Ты дзікая свіння, якая забралася на елку!

- **<u>Не, не</u>** і **<u>не.</u>** Я – вавёрка! Запомні: кошкі ядуць **<u>не толькі</u>** мышэй, чайкі ловяць не толькі рыбу, валасянкі глытаюць **<u>не</u>** адных мух, а вавёркі грызуць не толькі арэшкі.

**Н:** Перад вамі на лісточках тэкст. Паглядзіце на яго ўважліва. Гэта звычайны тэкст? Пра што кажа тое, што кожны сказ запісаны з новага радка і перад ім стаіць працяжнік? *(Гэта дыялог).*

**Н:** Паспрабуйце даць яму назву. «Скажы мне, што ты ясі, і я скажу, хто ты» – гэта аўтарская назва дадзенага тэксту.

- У якім стылі напісаны тэкст? Чаму? *(Размоўны).*

- Уважліва паглядзіце на словы, выдзеленыя тлустым шрыфтам. Прачытайце з імі сказы. Адкажыце на пытанне: гэта самастойныя або службовыя часціны мовы? *(Гэта службовыя часціны мовы, бо яны не маюць лексічнага значэння, да іх нельга паставіць пытання).*

- Гэта могуць быць прыназоўнікі? *(Не, яны не звязваюць словы)*

- Можа, гэта злучнікі? *(Не, яны не звязваюць аднародныя члены сказа або аднородныя члены сказа)*

- Перад намі новая службовая часціна мовы, якая называецца часціца.

Тэрмін «часціца» зусім малады. Ён з'явіўся толькі ў XIX стагоддзі. Першапачаткова ён ужываўся як найменне ўсіх службовых часцін мовы, а затым як назва адной з іх. Часціцам доўга прыйшлося даказваць сваю значнасць у свеце службовых часцін мовы. Вось як пра гэта распавядаецца ў адной з лінгвістычных казак:

«Ці было гэта ці не было, але, кажуць, неяк ці то прыназоўнікі, ці то злучнікі, ці то тыя і іншыя абвясцілі часціцам, што з усіх службовых часцін мовы яны самыя нязначныя – таму іх і называюць часціцамі, а часціца – гэта нешта такое маленькае, на што не звяртаюць увагі.

Але ж так жа можна пакрыўдзіць каго заўгодна! Вядома, часціцы пакрыўдзіліся! Як гэта ўсё непрыемна! І яны пайшлі, ні хвіліны не вагаючыся. Больш няшчаснага дня не было ў іх жыцці!

Калі б яны маглі, то сышлі б на край свету – няхай іх пашукаюць! Але часціцы не ведалі, як дабрацца туды, і адправіліся ў госці, у краіну Выклічнік, – за спагадай. Бо жыхары гэтай краіны на рэдкасць адчувальныя! Хіба вы не чулі пра гэта? Выклічнікі не змогуць вам назваць ні прадметаў, ні іх прыкмет або дзеянняў, але заўсёды гатовыя суперажываць вам. Яны паспрабавалі нават суцешыць часціцы:

-Вы зусім не такія ўжо маленькія, – казалі яны часціцам, ва ўсякім разе, не ўсе з вас: ёсць часціцы не маленькія па даўжыні – хіба, небудзь і асабліва няўжо.

-Так хіба ў гэтым справа? Як вы не разумееце ?! –шчыра здзіўляліся часціцы. – За нашай сціплай назвай і непрыкметнай знешнасцю хаваецца нешта вельмі важнае!

**Н:** Вось мы і павінны дапамагчы часціцам даказаць, што яны займаюць важнае месца ў гаворцы.

Для гэтага правядзём даследаванне.

(*на зялёных картках запісаны сказы. Адрозніваюцца яны толькі маленькімі словамі – часціцамі.*

*Заданне:* вызначаюць ролю часціц у сказе).

- Якое значэнне набывае кожны новы сказ?

*1-я каманда*

1. Я **не** чэмпіён. (Адмаўленне)
2. **Менавіта** я чэмпіён. (Удакладненне)

*2-я каманда*

3. **Няўжо** я чэмпіён ?! (Сумненне)
4. **Нават** я чэмпіён. (Узмацненне, абмежаванне)

*3-я каманда*

5. **Ну** я **і** чэмпіён! (незадавальненне)
6. **Гэта** я чэмпіён. (указанне)

**Н:** Дык якую ж ролю адыгрываюць часціцы ў нашым маўленні? *(Без часціц агульны змест тэксту не змяніўся, але іх выкарыстанне надае выказванням дакладнасць, выразнасць, эмацыянальнасць, бо часціцы перадаюць разнастайныя дадатковыя адценні значэння.)*

- **Н:** У вашых лістках ёсць табліца “ Пашпарт часціцы”( і на слайдзе). Зараз, працуючы з тэарэтычным матэрыялам, які таксама ёсць у вас на партах, паспрабуйце даць характарыстыку гэтай часціне мовы і запішыце патрэбную інфармацыю ў пустыя калонкі.

*Вучні, карыстаючыся тэарэтычным матэрыялам, запаўняюць табліцу ў картках, рыхтуюць адказы на пытанні пра часціцу:*
*а) Агульнае значэнне.*
*б) Марфалагічныя прыметы.* *(па камандах)*
*в) Сінтаксічная роля.*

| ***Часціца*** | ***Характарыстыка*** |
|---|---|
| **1. Агульнае значэнне** | *Службовая часціна мовы, якая з’яўляецца сродкам выражэння сэнсавых і эмацыянальных адценняў слоў, словазлучэнняў і сказаў;*<br>*сродкам утварэння ладоў дзеяслова* |
| **2. Марфалагічныя прыметы** | Не змяняецца. |
| **3. Сінтаксічная роля** | Не з’яўляюцца членам сказа. Не ўжываецца самастойна.<br>Некаторыя часціцы (***БЫ, Б і НЕ, НІ***) падкрэсліваюцца так, як словы, да якіх яны адносяцца. |

***(Праверка запаўнення табліцы: 1 каманда – агульнае значэнне, 2 – марфалагічныя прыметы, 3 – сінтаксічную ролю)***

*Лінгвістычная гульня «Цуды маскіроўкі». **(на блакітных картках)***

Заданне: *кожнай камандзе ў прапанаваных сказах неабходна падкрэсліць на лістках прыназоўнікі, злучнікі і часціцы.*

1. *У* лесе *і ў* полі душна. (прыназ, злучнік)

2. *І ў* бядзе чалавек мацнее. (часціца, прыназоўнік)

3. *А* надвор'е якое зацішнае! (часціца)

4. Дожджык вымачыць, *а* сонейка высушыць. (злучнік)

5. Паглядзіце, хлопцы, *што за* прыгажосць *побач з* лесам! (часціца, прыназ)

6. Яму здалося, *што* *за* дрэвам нехта стаіць. (злучнік, прыназоўнік)

7. Хмара набліжалася бліжэй *і* бліжэй. (злучнік)

8. *Унь* бяжыць *у* свет гасцінец, *над* ім сцелецца смуга… (часціца, прыназоўнік)

9. Я *не* ганю землі чужыя —
*Хай* іх сонца *не* абміне.
*Толькі* дзе *за* морам *ні* жыў я,
Беларусь мая снілася мне. (часціцы, прыназоўнік)

**Н:** А зараз праверым заданні.

***Фізкультхвілінка***

Устаньце, дзеткі, усміхніцеся,
Зямлі нашай пакланіцеся
За шчаслівы дзень учарашні.
Усе да сонца пацягніцеся,
Улева, управа нахіліцеся,
Верацёнцам пакруціцеся.
Раз прысядзьце, два прысядзьце
І за парты ціха сядзьце.

**Н:** - Што такое часціца?

- У залежнасці ад дадатковых значэнняў часціцы падзяляюцца на разрады:

1) Сэнсавыя часціцы
2) Эмацыянальныя
3) Мадальныя
4) Формаўтваральныя.

**Н:** У вас на сталах ляжаць карткі. На іх змешчана табліца "Разрады часціц". Але яна не запоўнена да канца. Вы павінны знайсці тыя лісткі, на якіх змешчаны, на вашу думку, неабходныя вам значэнні і запоўніць табліцу да канца. Дапамагаць будуць капітаны. Пасля нехта выступіць з абаронай сваёй табліцы.

*1-я каманда – сэнсавыя часціцы*
*2-я каманда – мадальныя часціцы*
*3-я каманда – эмацыянальныя часціцы*

| Сэнсавыя часціцы | Мадальныя часціцы | Эмацыянальныя часціцы |
|---|---|---|
| | | |
| | | |

**Разрады часціц**

| | | | |
|---|---|---|---|
| 1 | ***Сэнсавыя*** | **указальныя** | Вось (от, во), вунь (унь), гэта, роўна |
| | | **удакладняльныя** | Амаль, іменна, проста, якраз, сапраўды, менавіта, прыблізна, акурат |
| | | **вылучальна-абмежавальныя** | Толькі, абы толькі, хоць (бы), хаця б, чуць, ледзь, хіба толькі, выключна |
| 2 | ***Формаўтваральныя*** | **-** | Б (бы), хай (няхай), дай (дайце), давай (давайце) |
| 3 | ***Эмацыянальныя*** | **клічныя** | Што за, як, ну і, вось дык, вось як, вунь як |
| | | **узмацняльныя** | І, нават, ды, дык, ж (жа), аж (ажно), такі |
| 4 | ***Мадальныя*** | **сцвярджальныя** | Так, але, ага |
| | | **адмоўныя** | Не, ні, ані |
| | | **пытальныя** | Ці, хіба, няўжо, а, га |
| | | **пабуджальныя** | Хай (няхай), дай (дайце), давай (давайце), ну, ану |

**Н:** І ў нас засталася пустой калонка “Формаўтваральных часціц”. Слова вельмі гаваркое.

- Для чаго служаць гэтыя часціцы?
- А каб адказаць на пытанне - “Якія формы яны ўтвараюць”, зраблю невялікую падказку. (*на дошцы размяшчаю прыклады часціц, а вучні самастойна робяць вывад пра формаўтваральныя часціцы).*

4. **Замацаванне вывучанага**

Жоўтая картка

*Прачытайце сказы. Выдзеліце часціцы. Вызначце значэнне часціц. Надпішыце над часціцай яе разрад і значэнне.*

1. Размову вялі менавіта падлоўчы з настаўнікам, а ўсе іншыя слухалі і толькі зрэдку ўстаўлялі свае словы.
2. Родная прырода жыве ў кожнай кнізе Петруся Броўкі, амаль у кожным яго вершы.
3. Хай свята дружбы лепшым святам будзе, хай векам дружбы наш завецца век....

Аранжавая картка

*Прачытайце сказы. Выдзеліце часціцы. Вызначце значэнне часціц.*

*Надпішыце над часціцай яе разрад і значэнне.*

1. Прысеў наш Яська, закруціўся! Ды як пайшоў, ды як пусціўся!
2. Калі стамлюся некалі праз меру, адчуць бы мне падтрымку рук тваіх.
3. У Карэліцкім раёне, што на Гродзеншчыне, якраз у тых мясцінах, дзе знаходзіцца вёска Рудня, геолагі знайшлі жалезную руду.

Фіялетавая картка

*Прачытайце сказы. Выдзеліце часціцы. Вызначце значэнне часціц. Надпішыце над часціцай яе разрад і значэнне.*

1. Хто ж не любіць душою нашу маці-зямлю!
2. Як хітра, мудра збудавана! Як чыста, хораша прыбрана!
3. " Ці не чакаеш каго, Ганначка?" – " Не, мама".

**Н:** ***Заданні для першай групы:***

*Рашыце лінгвістычную задачку.*

Ці могуць часціцы страчваць сваю самастойнасць і станавіцца марфемамі слова – прыстаўкамі або постфіксамі? Калі так, то прывядзіце прыклады.

***Заданні для другой групы:***

*Рашыце лінгвістычную задачку*

Да юнака падышлі трое знаёмых. Першы спытаў: " Як ты закончыў школу?"

Другі ўсклікнуў: " Як, ты закончыў школу!"

Трэці сказаў: " Раскажы, як ты закончыў школу."

- Чым адрозніваюцца гэтыя сказы па сэнсе, будове і інтанацыі? Якой часцінай мовы з'яўляецца слова ЯК? *( прыслоўе, часціца, злучнік)*

*(Адказ да задання 1 групы: Могуць. Так, постфіксамі ў займенніках і прыслоўях сталі -небудзь і -сьці ( хто-небудзь, хтосьці), таксама словы абы, не, ні, ужываюцца і як часціцы ( абы зрабіць, не сказаць, ні свет ні зара), і як прыстаўкі: абы-хто, невялікі, ніхто.*

*Адказ да задання 2 групы: сказы розныя па мэце выказвання, будове. У 1 сказе "як" – прыслоўе, у 2 – часціца, у 3 – злучнік)*

## 5. Падагульненне і сістэматызацыя

***Тэст***

**1.** Адзначце правільнае сцвярджэнне:

***Часціцай называецца:***

А) службовая часціна мовы, якая выражае залежнасць назоўніка або займенніка ад іншых слоў у сказе;

Б) службовая часціна мовы, якая выражае розныя дадатковыя адценні значэння слоў, словазлучэнняў і сказаў, а таксама служыць для ўтварэння формаў слова (ладоў дзеяслова);

В) службовая часціна мовы, якая служыць для сувязі слоў у словазлучэнні і сказе.

**2.** Адзначце радок, дзе ўсе сцвярджэнні правільныя:

***Часціцы падзяляюцца на наступныя разрады:***

А) сэнсавыя, мадальныя, эмацыянальныя, формаўтваральныя;

Б) прасторавыя, прычынныя, тлумачальныя, мэтавыя;

В) злучальныя, падпарадкавальныя, вытворныя, невытворныя.

**3.** Адзначце радок, дзе ўсе часціцы формаўтваральныя:

А) вось, вунь, гэта;

Б) бы, хай, давайце;

В) хоць бы, як, няхай.

**4.** Адзначце правільнае сцвярджэнне:

***Формаўтваральныя часціцы служаць для ўтварэння наступных форм дзеяслова:***

А) формы загаднага ладу;

Б) формы будучага часу;

В) формы ўмоўнага ладу;

Г) формы абвеснага ладу.

Праверце сябе, ацаніце. *(Адказы на слайдзе.)* Падыміце руку, хто без памылак выканаў 1 заданне.( +малайцы, вы разабраліся з паняццем часціца): хто беспамылкова выканаў 2 заданне, 3, 4?

Давайце ўспомнім тыя задачы, што ставілі ў пачатку ўрока. *(слайд)* Як вы думаеце, мы з імі справіліся? Справіліся. На наступных занятках мы працягнем размову пра часціцу.

**5. <u>Падвядзенне вынікаў</u>**

**Н:** Я прапаную ацаніць сваю працу на ўроку і скласці творчую справаздачу – сінквейн "Часціца". Лепшы сінквейн у кожнай камандзе на выбар капітана будзе зачытаны ўголас.

**Н:** Адзнакі сёння паставяць капітаны каманд. *(выстаўленне і каменціраванне адзнак)*

**6. <u>Дамашняе заданне.</u>**

§43,44, табліцы-схемы. Пр.324

**7. <u>Рэфлексія.</u>**

- А цяпер паглядзіце, калі ласка, на эпіграф да сённяшняга ўрока. Як вы думаеце, чаму менавіта яго я ўзяла.